# МІКРАХВАЛЕВАЯ РЭЗАНАНСНАЯ ТЭРАПІЯ — МЕДЫЦЫНА XXI СТАГОДДЗЯ

**Сцвярджэнне, якое вынесена ў загаловак, некаму можа здацца занадта аптымістычным, асабліва заклапочаным шматгадовымі хваробамі людзям. Але тыя, каму гэта тэрапія нечакана і моцна дапамагла, а некаторых нават у прамым сэнсе паставіла на ногі, магчыма, будуць настойваць на тым, што не XXI стагоддзя, а ўвогуле наступнага тысячагоддзя. Ісціна, як вядома, ляжыць пасярэдзіне.**

Хаця мікрахвалевая рэзанансная тэрапія, ці, скарочана, МРТ, сапраўды новае слова ў лячэнні разнастайных хвароб, у яе аснове ляжаць старажытныя веды кітайскай і тыбецкай медыцыны. І каб пераканацца ў гэтым, дастаткова завітаць у цэнтр «Надзея», размешчаны ў Мінску па вул. Жудро, 40. Яго дырэктар Алена Нікіціна прыкладна 10 гадоў назад «захварэла» новай медыцынай (прабачце за каламбур) і з таго часу спецыялізуецца на гэтых метадах лячэння.

— Любая хвароба з пункту гледжання МРТ — гэта своеасаблівая паломка ў арганізме чалавека, які намі разглядаецца як адзінае цэлае. Таму МРТ лечыць не толькі пэўную хваробу, але і ўсю ахоўную сістэму арганізма. Інакш кажучы, аднаўляецца імунітэт чалавека. А ён залежыць ад стану нерваў, бо пераважная большасць хвароб узнікае ад расстройства нерваў. Таму сутнасць МРТ у лячэнні нервовай сістэмы чалавека. Для гэтага мы выкарыстоўваем шмат розных методык з рэфлексатэрапіі, нетрадыцыйнай медыцыны ў спалучэнні з апошнімі дасягненнямі біяфізікі, электронікі, медтэхнікі, — гаворыць Алена Мікалаеўна.

Крыху гісторыі. МРТ як афіцыйна дазволеная медыцына існуе на прасцягах былога СССР ужо больш за 15 гадоў. Першыя вынікі ўражвалі як прафесіянальных медыкаў, так і пацыентаў. Без аперацый і медыкаментаў знікалі застарэлыя язвы страўніка і гастрыты. Людзі пазбаўляліся ад бранхіяльнай астмы і цяжкіх бранхітаў, кідалі курыць. Лячыліся іншыя хваробы: неўрозы, вегета-сасудзістая дыстанія, частыя прастуды, хранічная стомленасць, імпатэнцыя, бяссонніца, гаймарыт, псарыяз, лішняя вага і многія іншыя.





Пацыентаў у гэтым метадзе вабіць тое, што працэс лячэння бязбольны, не дае пабочных эфектаў, не мае проціпаказанняў і ўзроставых абмежаванняў.

Здзіўляцца тут няма чаму. Метад МРТ, нягледзячы на яго навізну, заснаваны на ведах старажытных кітайцаў аб кропках і мерыдыянах цела. А кітайскія мерыдыяны — гэта тыя ж лініі электрамагнітнага поля чалавека.

Другі, не менш цікавы метад лячэння — так званая «крамлёўская» таблетка. Пра яе ў апошнія год-два шмат пішуць і, на думку доктара Нікіцінай, часам занадта шумяць. Аднак яна лічыць (і пра гэта сведчыць медыцынская практыка цэнтра), што таблетка вельмі карысная для тых, хто не можа наведваць «Надзею» рэгулярна для праходжання поўнага курса МРТ. Асабліва таблетка зручная для іншагародніх.

Яна толькі называецца таблеткай. А на самай справе гэта мікраэлектронны апарат, які ў арганізме чалавека ўключаецца і пачынае дасылаць лячэбныя імпульсы хворым органам. Пра падрабязнасці выкарыстання таблеткі вы можаце даведацца непасрэдна ў цэнтры па тэл. 255-06-02. Па прызнанню А. Нікіцінай, усе супрацоўнікі цэнтра спачатку паспрабавалі на сабе, потым на сваяках дзеянне таблеткі.

І ўсе яны ў той ці іншай ступені палепшылі стан свайго здароўя.

У практыцы цэнтра ёсць выпадкі, калі за 2-3 месяцы ўдавалася на 90 працэнтаў аздаравіць цяжка хворых на розныя хваробы людзей.

**Леанід ТУГАРЫН.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**